Чацвер, 24 Верасень 2020

Алега Паўлава прысудзілі да 8 сутак арышту, але не затрымалі: 25 верасьня – новы суд

Друкаваць (/news/sud/item/3751-paulava-prysudzili-da-8-sutak?tmpl=component&print=1) | Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=b4c87ca06ddf3e7d8cec5d621c085b0794c8ed64)

Ацаніць гэты матэрыял (1 голас)



(/media/k2/items/cache/b2c68359d7d2f527ead88c211efccdb2_XL.jpg)

Алег Паўлаў

24 верасьня ў судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску судзьдзя Ільля Белавус пакараў актывіста Алега Паўлава 8 соднямі адміністрацыйнага арышту за ўдзел у несанкцыянаваным мітынгу каля Віцебскага аблвыканкаму 16 жніўня. Паводле пратаколу, правапарушэньне кваліфікаванае паводле ч.3, арт. 23.34 КаАП.

Вінаватым сябе **Алег Паўлаў** не прызнаў, але ад удзелу ў мітынгу не адмаўляўся: каля аблвыканкаму знаходзіўся, у руках мэгафон трымаў, спрыяў выказваньню розных меркаваньняў, але праз гукаўзмацняльнае прыстасаваньне выказваліся іншыя людзі.

«Я быў у складзе тых прадстаўнікоў грамадзкасьці, якіх на наступны дзень, дзякуючы акцыі 16 жніўня, прыняло кіраўніцтва аблвыканкаму. Мы зьвярнуліся да ўладаў з патрабаваньнямі прызнаць выбары сфальсыфікаванымі, спыніць перасьлед, арышты і затрыманьні людзей…» – патлумачыў судзьдзі Паўлаў.

Грамадзкі актывіст зьвярнуў увагу на тое, што некалькі фактаў, выкладзеных у пратаколе, не адпавядаюць рэчаіснасьці. Так, у прыватнасьці, яго каля аблвыканкаму не затрымлівалі, у далоні ён ня пляскаў, бо трымаў мэгафон, ды і лёзунгаў не выгукваў.

Прагляд відэазапісу пацьвердзіў праўдзівасьць словаў Алега Паўлава.

> *«Тое, што я трымаў у руках мэгафон, не даказвае, што я яго выкарыстоўваў. Тым больш, мэгафон ня мой. Уладальнік мэгафону некуды раптам зьнік, і я проста яго захоўваў. Так, я трымаў яго ў руках»*, – патлумачыў Паўлаў.

Судзьдзя **Ільля Белавус** абвясьціў перапынак, пасьля якога пастанавіў прызнаць актывіста вінаватым і пакараць адміністрацыйным **арыштам тэрмінам на 8 содняў**. Тэрмін адлічваць з моманту фактычнага затрыманьня.

> Нагадаем, да гэтага Алега Паўлава затрымлівалі 10 жніўня, ён быў асуджаны на 15 содняў, але выйшаў на волю датэрмінова, адбыўшы толькі частку пакарання (амаль 5 сутак). Пазьней абласны суд адмяніў пастанову ад 12 жніўня і накіраваў справу на новы разгляд, які адбудзецца **25 верасня ў судзе Першамайскага раёну (пачатак – 11.00)**.

Таксама сёньня ў судзе Першамайскага раёну Віцебску судзьдзя **Міхаіл Юрчанка** паводле арт. 23.34 КаАП аштрафаваў на 5 базавых велічынь(135 рублёў) актывіста **Хрыстафора Жаляпава**. Ён прызнаны вінаватым ва ўдзеле ў шэсьці 6 верасьня.

Той жа самы Міхаіл Юрчанка пакараў штрафам у памеры 2 базавыя велічыні (54 рублі) віцяблянку **Тацяну Зелянову** (ч.1 арт. 23.34).

С. Горкі

Апублікавана ў Суд (/news/sud) , Мірныя сходы (/news/mirnyja-skhody)

Тэгі: Алег Паўлаў (/itemlist/tag/Алег%20Паўлаў) Ільля Белавус (/itemlist/tag/Ільля%20Белавус) Міхаіл Юрчанка (/itemlist/tag/Міхаіл%20Юрчанка) Хрыстафор Жаляпаў (/itemlist/tag/Хрыстафор%20Жаляпаў) артыкул 23 34 КаАП (/itemlist/tag/артыкул%2023%2034%20КаАП)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « За ўдзел у шэсьці пад швэйцарскім сьцягам Станіславу Цярэнцьеву аштрафавалі на 324 рублі (/news/sud/item/3749-ashtrafavali-na-324-rubli) Затрыманыя 24 верасня Сафія Цярэнцьева і Паліна Нітчанка застаюцца за кратамі СІЗА » (/news/sud/item/3752-zatrymanyya-24-verasnya)

Вярнуцца ў пачатак (/news/sud/item/3751-paulava-prysudzili-da-8-sutak#startOfPageId3751)

© 2011 - 2023 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

